**Edmund Jarmusik**
*Grodzieński Państwowy Uniwersytet im. Janki Kupały, Białoruś*

# РЭЛІГІЯ Ў ЖЫЦЦІ, ТВОРЧАСЦІ І ДЗЕЙНАСЦІ ЭЛІЗЫ АЖЭШКІ

Будучая пісьменніца Эліза Ажэшка нарадзілася ў шляхецкай сям'і Паўлоўскіх, дзе захоўваліся і шанаваліся рэлігійныя каталіцкія традыцыі, аднак не існавала рэлігійнага фанатызму. Бацька Элізы, Бенедыкт Паўлоўскі (1788–1843), па адукацыі юрыст, быў выхаваны на літаратуры эпохі Асветніцтва, літаратуры, якая так бліскуча была ахарактарызавана Ф.Энгельсам: «Вялікія мужы, – пісаў Энгельс, – падрыхтавалі ў Францыі грамадскую свядомасць для ўспрымання будучай магутнай рэвалюцыі, самі выступалі ў вышэйшай ступені рэвалюцыйна. Яны не прызнавалі ніякага аўтарытэту. Рэлігія, погляд на прыроду, дзяржаўны лад, грамадства – усё было падвергнута бязлітаснай крытыцы. Усё павінна было апраўдаць сваё існаванне перад судзілішчам разума або ж ад свайго існавання адмовіцца. Мыслячы розум быў прызнаны адзіным крытэрыем усіх рэчаў».

Паўлоўскі, які вырас на літаратуры «вялікіх мужоў» Францыі – сачыненнях Вальтэра, Руссо, Дзідро і многіх іншых, увогуле не быў рэвалюцыянерам. Але ён быў поўны «вольнадумных» памкненняў, лічыўся вальтэр'янцам, старшынстваваў у масонскай ложы. Ён адкрыта прапаведаваў неабходнасць усебаковага карэннага абнаўлення жыцця Польшчы. Ён прымыкаў да палітычных традыцый найбольш прагрэсіўнай часткі польскага сярэдняга дваранства; у саюзе іменна з гэтай палітычнай сілай перадавыя элементы польскіх гарадоў стварылі Канстытуцыю 3 мая 1791 года, у адказ на абвяшчэнне якой алігархія паздрадніцку заклікала чужаземныя войскі для трэцяга і апошняга (1795) падзелу краіны. Адраджэнне Польшчы на новых пачатках, праясненню якіх вельмі садзейнічаў натхняючы прыклад французскай рэвалюцыі

канца XVIII стагоддзя, спынілася за палітычнай смерцю дзяржавы. Такім чынам, бацька пісьменніцы належаў да тых прадстаўнікоў радавітай сярэдняй шляхты, якія ідэйна былі звязаны з лепшымі гуманістычнымі традыцыямі перыяду еўрапейскага і польскага Асветніцтва[1].

Аднак бацьку Эліза страціла, калі ёй было два гады, таму памятаць яго дзяўчынка не магла. Ад бабулі яна даведалася, што бацька быў атэістам. Пасля яна ўспаміналa: «Колькі ж, седзячы каля ног бабулі, я пачула яе апавяданняў аб годнасці і розуме бацькі, якія перарываліся цяжкімі ўздыхамі то з нагоды яго заўчаснай смерці, то з нагоды яго рэлігійнага нявер'я». Тым не менш, на працягу ўсяго жыцця Эліза Ажэшка падкрэслівала сілу яго ўплыву на станаўленне свайго характару. Вобраз бацькі быў вельмі ўстойлівым у асабістым жыцці і ў фарміраванні яе нацыянальна-патрыятычных перакананняў. Ад бацькі ёй перадаліся свабодалюбства, шанаванне годнасці чалавека, гуманізм, якія ў будучым сталі неад'емнай часткай яе характару і знайшлі сваё ўвасабленне у творчасці і грамадскай дзейнасці.

Усё жыццё Эліза Ажэшка перажывала горыч утраты блізкага ёй чалавека, якога яна не ведала і не адчула ад яго бацькоўскай ласкі. Разам з тым, пісьменніца верыла, што гэтая сустрэча адбудзецца, але там, на нябёсах. Яна пісала: «Калі ж я закончу свой зямны шлях, калі выканаю ўсё, што наканаваў мне Бог, калі выплачу ўсе слёзы жыцця і ўся горыч закончыцца, тады ў чыстае неба возьме мяне Гасподзь. Там я сустрэну цябе, ойча, там дачка твая, чыстая, непарочная, там, ля сэрца твайго, я да канца вылечу свае зямныя раны і, ахутаныя ясным небам, мы застанемся разам назаўсёды»[2]. Але, як бацька, атэісткай яна не стала. Вернасць Богу і каталіцкай веры ёй прывівалі маці і бабуля.

На тэрыторыі маёнтка Мількаўшчызна была каталіцкая капліца, што стаяла пры дарозе, у ліпавай алеі, якая вяла да двара, і была асабістай уласнасцю Ажэшкаў, і служыла мясцоваму насельніцтву. У перыяд ад 20 верасня 1866 года і да 7 мая 1867 года, як сведчаць факты Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Гродне, яна стала прадметам тайнай перапіскі паміж генерал-губернатарам Эдвардам Баранавым, адміністратарам Паўночна-Заходняга краю, і гродзенскім

[1] Славятинский, Н.А.Элиза Ожешко. Очерк жизни и творчества / Н.А. Славятинский / [Электронный ресурс] / http: // www. e-reading.club/bokreader.php/1011803. Дата доступа 20.10.2016.

[2] Мусиенко, С.Ф. Мифы и реальность в жизни и творчестве Элизы Ожешко / С.Ф. Мусиенко. В: Эліза Ажэшка ў эстэтычнай прасторы славянскіх краін. Зборнік артыкулаў. Пад нав. рэд. С.П. Мусіенкі, М.М. Хмяльніцкага. – Мінск: Кнігазбор, 2013. С. 28 – 30.

губернатарам. Шукалася зачэпка, каб ліквідаваць капліцу, да якой хадзіла многа мясцовых сялян-католікаў. Гродзенскі губернатар накіраваў пісьмо Э. Баранаву, у якім прасіў дазволу знесці капліцу, аргументуючы тым, што пабудова драўляная, невядома калі пабудавана без дазволу ўлад, знаходзіцца ў непажаданым месцы, і па эстэтычных меркаваннях не можа быць перададзена праваслаўным. Прыводзіліся дадзеныя аб тым, што капліца мае невялікую вартасць, яе наведваюць каля 303 католікаў, у той жа час праваслаўных налічваецца 386 асоб. У капліцы не праходзяць набажэнствы, бо сама «памешчыца» Ажэшка ў 1865 годзе забрала з яе прадметы культу: алтарык і абразы, і захоўвае іх ва ўласным пакоі, а над астатнім убранствам даверыла апеку ксяндзу.

Гэтыя аргументы былі дастатковымі для закрыцця капліцы. Католікаў з Мількаўшчызны далучылі да каменскай парафіі, а Ажэшку пазбавілі яе ўласнасці. Увосень 1869 года яна пакінула Мількаўшчызну і пасялілася ў Гродне[3].

Тут пачынаецца новы этап яе жыцця і творчасці. Лёс прыгнечанага, абяздоленага народа – гэта першае, што хвалявала пісьменніцу. А народ на яе радзіме – у маёнтках яе бацькі і мужа, быў прадстаўлены, у першую чаргу, сялянствам: беларусамі ці палякамі па нацыянальнасці, праваслаўнымі, католікамі або ўніятамі па веравызнанні. Паводле перапісу насельніцтва Расійскай імперыі, які адбыўся ў 1897 годзе, у Гродзенскай губерніі пражывала 1603,4 тыс. чалавек, з іх 255 тыс. (15,9 %) былі жыхарамі гарадоў. Буйнейшымі былі Беласток (66,0 тыс.), Гродна (46,9 тыс.), Брэст-Літоўск (46,6 тыс.). Насельніцтва гарадоў было многанацыянальным і поліканфесійным, пры гэтым пераважалі яўрэі, што было абумоўлена ўведзенай царскім урадам рысай яўрэйскай аседласці. Так, калі за крытэрый нацыянальнасці ўзяць мову, якой карысталася насельніцтва, то ў Гродна пражывала 47,7 % яўрэяў, рускіх – 22,4 %, палякаў – 14,6 %, беларусаў – 11,6 %. У той жа час у паветах (уездах) пераважала мова беларуская (Гродзенскі павет – 81,8 %, Ваўкавыскі – 87,1 %, Пружанскі – 78,5 %, Слонімскі – 86,3 %, Сакольскі – 96,7 %), таму па нацыянальнаму складу пераважалі сяляне беларусы[4].

Пісьменніца паказвае ў сваіх творах беларускі народ – мнагалікі, неразгаданы, невядомы да гэтага часу польскаму чытачу. У гэтага

[3] Bursztyńska, H. Z archiwów Grodna o Orzeszkowej / H.Bursztyńska // w: Powroty do Elizy Orzeszkowej (1995–1996). – Grodno, 1997, s. 50.

[4] Гродненская губерния / [Электронный ресурс ] / http: // www.nado.znate.ru / Гродненская губерния. Дата доступа 22.10.2016.

народа свой быт, псіхалогія, звычаі, менталітэт, свае вераванні, якія ўваходзяць каранямі ў язычніцтва. Ва ўмовах прыгнёту, забітасці і галечы нараджалася фаталістычная вера беларускага сялянства ў лёс, у чарадзейства, у «нячыстую" сілу, якая можа ўсяліцца ў чалавека, і тады яна пачынае шкодзіць астатнім людзям. Адзінае выйсце пазбавіцца ад гэтых злых сіл – фізічная расправа над імі. Таму ў беларусаў забойства «вядзьмаркі», напрыклад, не лічылася за грэх, тым болей, што яно было санкцыяніравана гістарычнай традыцыяй сярэдневяковай інквізіцыі. На Беларусі яно абапіралася на сілу дзяржаўнай улады да канца XVIII стагоддзя. Беларускі гісторык Мітрафан Доўнар-Запольскі пісаў: «Вось цікавае паказанне паловы XVIII стагоддзя – ліст упраўляючага маёнткам графа Тышкевіча да свайго пана: «Яснавяльможны пане! Са зваротнымі сялянамі даношу, што з вашага дазволу спаліў я шэсць чараўніц; тры прызналіся, астатнія – не. Дзве з іх пажылыя, трэцяя таксама гадоў пад пяцьдзесят, да таго ж адзінаццаць дзён яны ўсе прасядзелі ў мяне пад чанам, дык, відаць, і другіх зачаравалі. Вось і цяпер панскае жыта ў двух месцах заломана. Я збіраю цяпер з дзесяці касцёлаў святую ваду і буду на ёй варыць кісель: кажуць, абавязкова ўсе ведзьмары прыбягуць прасіць кісялю: тады яшчэ мне будзе работа».

Гэтыя гістарычныя факты аб ганеннях на «ведзьмаў» у мінулым, як і звязаныя з гэтым павер'і сялянства, знайшлі адбітак у аповесці «Дзюрдзі» (1885). Падзеі адбываюцца ў невялікай вёсцы Сухая Даліна, што на Гродзеншчыне.  Эліза Ажэшка праўдзіва паказвае беларускае сялянства 80-х гадоў XIX стагоддзя, якое захавала ў сваёй свядомасці перажыткі анімістычных уяўленняў аб сіле прыроды. Тое невядомае, што тоіцца за межамі іх ведаў, уяўляецца нечым таямнічым, страшным, «нячыстай» сілай. Па народных вераваннях, такая таямнічая сіла можа прыносіць карысць або шкодзіць. У аповесці «Дзюрдзі» па-мастацку праўдзіва паказаны перажыткі паганскага светаразумення і старажытных вераванняў.

Старая бабка расказвае Пятрусі казку, у якой народная памяць захавала акт спальвання «ерэтыкоў» у тыя далёкія часы з благаславення царквы: «А потым расклалі сярод кірмашу вогнішча і кат у чырвонай вопратцы схапіў Марцысю за валасы і кінуў яе ў агонь. Агонь палаў такі вялікі, што амаль даставаў да неба; у ім, як трэска, гарэла Марцыся, і так страшна стагнала, што стогн яе разлягаўся па ўсім свеце, далятаючы чуць не да неба, а ад яе цела, якое гарэла ў моцным агні, разыходзіўся смурод па ўсім горадзе… Ксяндзы ж у славу Пана Бога громка спявалі святыя песні, і сам кароль, што сядзеў на троне, радаваўся і згадваў радавацца

ўсім людзям, што пакарана ведзьма, якая прадала сваю хрысціянскую душу нячыстаму»[5].

Асноўнае апавяданне пісьменніца пачынае з падрабязнага апісання вядомага абрада заклінання малочнай ведзьмы, паводле якога ведзьма павінна з'явіцца на касцёр з асінавых дроў. Сімвалічны выбар месца для абрада: на перакрыжаванні дарог за ваколіцай. З аднаго боку перакрыжавання стаіць высокі крыж – сімвал хрысціянскай веры. А насупраць – ляжыць агромністы, паросшы сівым мохам валун, які сімвалізуе язычніцкія вераванні сухадалінцаў, што сваімі каранямі ўваходзяць у сівую даўніну. Іменна тут, каля валуна, і пачынаецца магічны абрад Пятра Дзюрдзя высячэння агню. Фетышызм агню – таксама рыса традыцыйнага светапогляду беларусаў, продкі якіх надавалі агню вялікую магічную сілу. З даўніх часоў агонь выкарыстоўваўся для ачышчэння памяшканняў «ад уроку» і «нячыстай» сілы, ім карысталіся, каб раскрыць ісціну пад час судовых працэсаў, а жрацы, вінаватыя ў тым, што свяшчэнны агонь згасаў, жорстка караліся.

З усіх прысутных на абрадзе толькі адзін малады Клеманс Дзюрдзя спрабаваў усумніцца у існаваніі ведзьмы, але адразу атрымаў «важкі» адпор бацькі: «… Калі нашы дзяды-прадзеды верылі, ну, дык, гэта праўда… Для таго мы і палім асіну, на якой павесіўся пёс акаянны Іуда, які прадаў Госпада нашага Іісуса. Аман». Ажэшка падкрэслівае, што ў менталітэце беларускага селяніна неразрыўна перапляліся язычніцтва з хрысціянствам. На гэта ўказвае не толькі месца для магічнага абрада, але і сам абрад, а таксама абавязковы выбар іменна асінавых дроў для рытуальнага кастра. Сярод дрэў іменна асіна лічылася праклятаю, таму што на ёй павесіўся Іуда, і таму яна па сённяшні дзень дрыжыць. Асіну клалі ў магілы калдунам, а калом з асінавага ствала прабівалі цела вампіраў, упыраў, каб яны ніколі не вышлі з магіл.

Неад'емнай часткай светапогляду жыхароў вёскі, разам з верай у Хрыста, з'яўляецца вера ў злых духаў, якія ўвасобіліся ў іх свядомасці ў вобразах «нячыстай» сілы. Бытавала павер'е, што ў вампіраў, абаратняў, упыроў, ведзьмаў, калдуноў, чарцей пераўтвараліся душы дрэнных людзей. «Нячыстая» сіла заўсёды імкнулася нанесці шкоду людзям, гаспадарцы, хатнім жывёлам. У гэтай веры вытокі страху і нянавісці, якую выказваюць жыхары Сухой Даліны да Пятрусі, галоўнай гераіне рамана[6].

[5] Гапава, В. Эліза Ажэшка. Жыццё і творчасць / В.Гапава / – Мінск: Беларусь, 1969. с. 137 – 139

[6] Билютенко, Е. Тема наднеманской деревни в романе Элизы Ожешко «Дзюрдзи» / Е.

Увагу пісьменніцы прыцягваў і яўрэйскі народ з яго неразгаданым, нярэдка скрытым ад шырокай публічнасці ладам жыцця. Абсалютная большасць прадстаўнікоў яўрэйскай супольнасці Гродна вызнавала іўдаізм. Па сваёй сутнасці ён з'яўляўся не толькі рэлігіяй, але асабліва этыкай і ладам жыцця. Запаветы іўдаізму распаўсюджваліся не толькі на набажэнствы, але і кіравалі міжчалавечымі зносінамі, дабрачыннасцю, уплывалі на інтэлектуальнае жыццё, мастацкую творчасць, правілы добрага тону, клапаціліся пра здароўе і правільнае харчаванне народа. Менавіта рэлігія была для яўрэяў Беларусі азначанага перыяду крыніцай фарміравання этнічнай самасвядомасці.

Што датычыць Гродна, то ён быў значным рэлігіёзным цэнтрам. Пра гэта сведчыць дынаміка росту культавых установ. Калі ў 1834 годзе тут была толькі адна каменная сінагога, 10 малітоўных школ, то ў 1853 годзе – 1 сінагога на 500 прыхаджан і 19 малітоўных школ на 75 – 300 вернікаў. У 1870 годзе колькасць іўдзейскіх храмаў у нашым горадзе яшчэ больш узрасла: акрамя сінагогі, тут яшчэ існавала больш за 30 малітоўных школ.

Разам з тым, у рэлігійных перакананнях вялікага кола беларускіх яўрэяў у апошняй чвэрці XVIII – першай палове XIX стагоддзя адбываюцца вялікія змены, звязаныя з узнікненнем новых плыняў у іўдаізме. У гэты час распаўсюджваецца хасідызм, у якім была пераасэнсавана роля асобы ва ўзаемаадносінах з Богам. Прыхільнікі гэтай плыні лічылі, што ўсё ў жыцці чалавека павінна быць радасным, вясёлым і праведным, што трэба любіць людзей і Бога, калі жадаеш апраўдаць сваю прысутнасць на зямлі. Хасідскія набажэнствы суправаджаліся вясёлымі спевамі і скокамі, адсюль і пайшла простанародная назва хасідаў – скакуны. У сярэдзіне XIX стагоддзя на Беларусі з'яўляецца грамадскі рух Гаскала, прыхільнікі якога «маскілім» прапагандавалі свецкае навучанне і заклікалі адмовіцца ад сярэднявечнага менталітэту. Плынь мела пазітыўнае значэнне, бо несла новыя веды ў замкнёнае жыццё абшчыны, але аб'ектыўна вяла да асіміляцыі, бо маскілім падвяргалі сумненню асобныя прынцыповыя палажэнні рэлігіі і нацыянальнай культуры. Артадоксы варожа ўспрымалі Гаскалу[7].

Назіранні за жыццём яўрэйскай супольнасці ў Гродна далі цікавы матэрыял для аповесці Элізы Ажэшкі «Меер Эзафовіч» (1878),

Билютенко. В: Творчасць Элізы Ажэшкі і беларуская культура. Зборнік навуковых прац. Пад рэд. С.П. Мусіенкі. – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2002, с. 81 – 87.

[7] Сабалеўская, В. Спрадвечныя іншаземцы: старонкі гісторыі гарадзенскіх яўрэяў / В.Сабалеўская. – Гародня, 2000, с. 43–47.

прысвечанай жыццю яўрэйскага народа з яго каставымі забабонамі, традыцыямі, цемрай і з яркім характарам новага чалавека, што вырваўся з учэпістых шчупальцаў асяроддзя і імкнуўся да новага жыцця. Падзеі адбываюцца ў невялікім мястэчку Шыбове, у якім жыве сям'я Эзафовічаў паводле традыцый, якія бяруць пачатак яшчэ ў XVI стагоддзі. Міхал Эзафовіч, які з'яўляецца прыхільнікам філасофіі Маймонідэса, ужо ў часы Адраджэння хацеў рэфармаваць яўрэйскую супольнасць у духу рацыяналізму і асветы. Саставіў трактат-тэстамант, які перадаваўся з пакалення ў пакаленне. У тым самым духу дзейнічаў Херц Эзафовіч у перыяд Вялікага Сейму. Цяпер тэстамэнт хоча рэалізаваць малады Меер. Ён прапаведуе адкрытасць яўрэйскай супольнасці, пашырэнне ведаў і ўдзелу у грамадскім жыцці. Яго праціўнікам з'яўляецца сям'я Тодрасаў, кансерватыўных і артадаксальных равінаў, якія змагаюцца за тое, каб утрымаць уладу над кагалам і людскімі душамі. Меер прайграе гэтую бітву, яго выганяюць з Шыбова, але яго ідэі западаюць у свядомасць маладога пакалення[8].

У аповесці Эліза Ажэшка малюе збіральны вобраз складанай і неадназначнай яўрэйскай супольнасці. Пісьменніца першая з польскіх аўтараў звярнула ўвагу на яўрэйскае пытанне, глыбока пазнала яўрэйскую нацыю, як ніхто ў Польшчы. Гэты твор – першы сярод найвялікшых польскіх апавяданняў гэтага перыяду аб свеце незвычайным, экзатычным. Назіранні Э. Ажэшкі абапіраліся на глыбокія веды гісторыі яўрэйскага народа – яна ведала Біблію, была знаёма са зместам Талмуда, чытала даследаванні сучасных і некаторых сярэдняввяковых аўтараў па гебраістыцы. Літаратурная крытыка прызнала аповесць першым шэдэўрам пісьменніцы, які ў хуткім часе быў перакладзены на многія еўрапейскія мовы. Крашэўскі параўноўваў высокае майстэрства вобразаў гэтай аповесці, узятых з натуры, з жывапіснымі палотнамі Яна Матэйкі[9].

Выключным па мастацкай сіле атрымалася апавяданне з жыцця яўрэйскай беднаты «Самсон Магутны» (1877). Яго герой, бядняк і філосаф – талмудзіст Шымшаль, забыў пра ўсё на свеце і заняўся чытаннем рэлігійных кніг. Ён не заўважыў, як жыццё прайшло міма яго. Галота ў сям'і, змрочны пакой з цёмным акном на тратуар, заўчасна састарэлая жонка і шасцёра бедных дзяцей не маглі парушыць яго

[8] Eliza Orzeszkowa. Życie i twórczość. Powieści / [Электронны рэсурс] / Culture.Pl. / http: // www. culture.pl/pl/tworca/eliza – orzeszkowa. Дата доступа 20.10.2016.

[9] Гапава, В. Эліза Ажэшка. Жыццё і творчасць / В.Гапава / – Мінск: Беларусь, 1969. с. 93, 94

сузіральнага спакою і бясконцай работы думкі над асэнсаваннем старажытнага тэксту. Амаль эскізна створаны вобраз сям'і Шымшаля, але і ў ім адчуваецца рука моцнага мастака.

З мастацкім адчуваннем меры паказана, як у нетрах пакорлівага народа пачынае абуджацца самасвядомасць – ад гэтых малюнкаў павявае трагізмам. Напярэдадні Новага года яўрэйская грамада вырашыла даць пастаноўку «Самсона і Далілы». Шымшаль цудоўна сыграў ролю мудрага цара – у гэтым бедняку тояцца багатыя творчыя сілы, вялікі розум, здольны да абстрактнага мыслення. Незвычайным ён вырысоўваецца і перад вачыма свайго старэйшага хлопчыка, што сядзеў дзесьці на заднім радзе. Натхнёны роляй, паверыўшы ў сваю сілу, у царскай вопратцы ён вяртаецца марознай ноччу дадому. І тут паказаны рэзкі кантраст тэатральнай сцэны, дзе чалавек упершыню адчуў сябе магутным, мудрым, справядлівым, і ўласнага жыцця – змрочны пакой, закураная лямпа, замёрзлыя шыбы, два саламяныя матрацы на падлозе і на іх пяцёра дзяцей.

Абуджаная свядомасць адарванага ад ад зямных клопатаў філосафа-бедняка канчаецца пасіўным бунтам. Шымшалю здаецца, што за акном узнялася высокая лесвіца да самага неба. На вяршыні гэтай лесвіцы сядзіць мудры яўрэйскі Бог, зверху ён бачыць несправядлівасць, галечу, жахі цяперашняга жыцця. Шымшаль узнімае з сенніка свайго самага меншага сына, падымае да акна і, нібы даручаючы яго справядліваму Богу, кажа хлопчыку: «Будзь магутным!»[10].

Хрысціянскае выхаванне Элізы Ажэшка ў поўнай меры праявіліся ў яе дабрачыннай дзейнасці, якую яна паспяхова ажыццяўляла ў Гродна. Так, 10 чэрвеня на горад абрынулася вялікая бяда. Пажар, які пачаўся на Сянным рынку, у лічаныя гадзіны ахапіў увесь горад. Так успамінае пра гэта вядомы публіцыст Віктар Гамуліцкі: «Адна з ажыўленных і багатых вуліц Гродна за 48 гадзін пераўтварылася ў дымнае папялішча. Афіцыйныя дакументы адзначаюць, што згарэла 512 жылых дамоў, згарэлі лепшыя магазіны і крамы, 3 тыпаграфіі, будынак гасцініцы і шмат іншага. Быў знішчаны пажарам і дом, дзе жыла Эліза Ажэшка па вуліцы Сянной. Моцна пашкоджана бібліятэка пісьменніцы і 2 рукапісы. Практычна яна страціла ўсю сваю маёмасць. Але пры выглядзе агульнай бяды Ажэшка зноў жыла, як і раней, чужымі інтарэсамі. У першыя дні яна стала адной з кіраўнічак камітэту дапамогі пагарэльцам, унікала ў іх

[10] Гапава, В. Эліза Ажэшка. Жыццё і творчасць / В.Гапава / – Мінск: Беларусь, 1969. с. 94, 95

скаргі. А затым развозіла бялізну, адзенне, чай, лякарствы. На працягу ўсяго жыцця яна імкнулася дапамагчы бедным і абяздоленым, і на многія гады яе імя стала сімвалам дабрачыннасці і культурнай дзейнасці»[11].

**Спіс літаратуры**

Славятинский, Н. А. Элиза Ожешко. Очерк жизни и творчества / Н.А. Славятинский / [Электронный ресурс] / http: // www. e-reading.club/ bokreader.php/1011803. Дата доступа 20.10.2016.

Мусиенко, С. Ф. Мифы и реальность в жизни и творчестве Элизы Ожешко / С.Ф. Мусиенко. В: Эліза Ажэшка ў эстэтычнай прасторы славянскіх краін. Зборнік артыкулаў. Пад нав. рэд. С.П. Мусіенкі, М.М. Хмяльніцкага. – Мінск: Кнігазбор, 2013.

Bursztyńska, H. Z archiwów Grodna o Orzeszkowej / H.Bursztyńska // w: Powroty do Elizy Orzeszkowej (1995 – 1996). – Grodno, 1997.

Гродненская губерния / [Электронный ресурс ] / http: // www.nado. znate.ru / Гродненская губерния. Дата доступа 22.10.2016.

Гапава, В. Эліза Ажэшка. Жыццё і творчасць / В.Гапава / – Мінск: Беларусь, 1969.

Билютенко, Е. Тема наднеманской деревни в романе Элизы Ожешко «Дзюрдзи» / Е. Билютенко. В: Творчасць Элізы Ажэшкі і беларуская культура. Зборнік навуковых прац. Пад рэд. С.П. Мусіенкі. – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2002.

Сабалеўская, В. Спрадвечныя іншаземцы: старонкі гісторыі гарадзенскіх яўрэяў / В.Сабалеўская. – Гародня, 2000.

Eliza Orzeszkowa. Życie i twórczość. Powieści / [Электронны рэсурс] / Culture.Pl. / http: // www. culture.pl/pl/tworca/eliza – orzeszkowa. Дата доступа 20.10.2016.

Элиза Ожешко / [Электронный ресурс] / Grodno.by / http: // www. grodno.by/grodno/history/biblio. Дата доступа 20.10.2016.

Orzeszkowa, Eliza. Dziurdziowie / E.Orzeszkowa. – Warszawa: Czytelnik, 1975. – 192 s.

Orzeszkowa, Eliza. Meir Ezofowicz / E.Orzeszkowa. – Warszawa: Czytelnik, 1988. – 427 s.

Orzeszkowa, Eliza. O Żydach i kwestii żydowskiej / E. Orzeszkowa. – Warszawa: Nakład Geberthnera i Wolfa,1913. – 235 s.

[11] Элиза Ожешко / [Электронный ресурс] / Grodno.by / http: // www. grodno.by/grodno/history/biblio. Дата доступа 20.10.2016.

**Edmund Jarmusik**
*Grodzieński Państwowy Uniwersytet im. Janki Kupały, Białoruś*

## РЭЛІГІЯ Ў ЖЫЦЦІ, ТВОРЧАСЦІ І ДЗЕЙНАСЦІ ЭЛІЗЫ АЖЭШКІ

### Резюме

В статье раскрывается роль религии в жизни и творчестве великой писательницы Элизы Ожешко. Её отец, Бенедикт Павловский, по своим взглядам был атеистом, однако он умер, когда дочери было два года. Мать и бабушка воспитывали юную Элизу в религиозном духе. Религия и религиозные верования в жизни героев произведений писательницы играют особую роль . Это – неотъемлемая часть мировоззрения, традиций и обычаев народа. Гнёт, забитость и нищета порождали веру белорусского крестьянства в чародейство, нечистую силу, злых духов. Архаические пережитки древних верований и их влияние на поведение жителей маленькой деревни Сухая Долина, что на Гродненщине, мастерски описаны в повести «Дюрди». Внимание писательницы привлекла традиционная религия евреев – иудаизм. В повести «Меер Эзофович» Э.Ожешко показала антагонизм ортодоксального, консервативного течения в иудаизме с его кастовыми предрассудками, традициями и нового течения – хасидизма, представители которого стремились к переосмыслению отношений человека с Богом. Идеалистические переживания главного героя – бедняка и философа, талмудиста Шимшала глубоко раскрыты в рассказе «Самсон Могучий». Вера во всемогущего еврейского Бога, на которого Шимшал возлагал большие надежды, разбивается о жестокие реалии жизни и быта простой еврейской семьи. Христианское милосердие, сострадание к простым людям в полной мере проявились в благотворительной деятельности писательницы, которой она занималась на протяжении всей своей жизни.

**Ключавыя словы:** абрад, Біблія, ведзьма, дабрачынная дзейнасць, забабоны, кагал, капліца, светапогляд беларусаў, Талмуд, уніяты, чарадзейства.

**Edmund Jarmusik**
*Yanka Kupala State University of Grodno Belarus*

## RELIGION IN THE LIFE, WRITINGS AND WORK OF ELIZA ORZESZKOWA

### Summary

The paper reveals the role of religion in the life and work of a great writer - Eliza Orzeszkowa. Her father, Benedykt Pawłowski, was an atheist, but he died when his daughter was two years old. Her mother and grandmother raised young Eliza in a religious environment. Religion and religious beliefs play a special role in the life of characters created by the writer. Religion is an integral part of the world, traditions and customs of the people. The oppression, wretchedness and poverty engendered the Belarusian peasants' belief in witchcraft, evil energy, evil spirits. The archaic remnants of ancient beliefs and their impact on the behaviour of the inhabitants of a small village of Dry Valley, in the Grodno region, were masterfully described in the story "Dziurdziowie" ["Dyurdi"]. Orzeszkowa was attracted by the traditional religion of the Jews – Judaism. In a novel "Meir Ezofowicz", she showed the antagonism between the orthodox, conservative movement in Judaism, with its caste prejudices, tradition and new trends - Hasidism, whose members attempted to rethink the relationship between man and God. Idealistic feelings of the protagonist in ta story "Silny Samson" ["The Mighty Samson"], a poor man and philosopher, Talmudist Szymszel are profoundly disclosed. Faith in the almighty Jewish God, for whom Szymszel had great hopes, broke down in confrontation with the cruel realities everyday life of simple Jewish family. Christian charity, compassion for ordinary people is fully manifested in the charitable activities of the writer, which continued throughout her life.

**Słowa-klucze**: ritual, the Bible, witch, charity, superstitions, qahal, the Belarusian outlook, the Talmud,  Uniates, witchcraft.

**Edmund Jarmusik**
*Grodzieński Państwowy Uniwersytet im. Janki Kupały, Białoruś*

## RELIGIA W ŻYCIU, TWÓRCZOŚCI I DZIAŁALNOŚCI ELIZY ORZESZKOWEJ

### Podsumowanie

W artykule ujawniona zostaje rola religii w życiu i twórczości wielkiej pisarki Elizy Orzeszkowej. Jej ojciec, Benedykt Pawłowski, w swoich poglądach był ateistą, zmarł jednak, gdy córka miała dwa lata. Matka i babcia wychowywały młodą Elizę w duchu religijnym. Religia i przekonania religijne w życiu bohaterów dzieł pisarki odgrywają szczególną rolę. Jest to integralna część światopoglądu, tradycji i obyczajów narodu. Śmierć, nędza i ubóstwo rodziły wiarę białoruskiego chłopstwa w czary i wpływ duchów. Archaiczne relikty dawnych wierzeń i ich wpływ na zachowanie mieszkańców małej wsi Sucha Dolina na Grodzieńszczyźnie zostały fachowo opisane w powieści *Dziurdziowie*. Uwagę pisarki przyciągnęła tradycyjna religia żydowska – judaizm. W opowiadaniu *Meir Ezofowicz* Eliza Orzeszkowa pokazała antagonizm ortodoksyjnego, konserwatywnego nurtu w judaizmie z jego kastowymi uprzedzeniami, tradycjami i nowego nurtu – chasydyzmu, którego przedstawiciele dążyli do przemyślenia relacji człowieka z Bogiem. Idealistyczne przeżycia głównego bohatera – biedaka i filozofa, talmudysty Szymszala, głęboko ujawnione w opowiadaniu *Silny Samson*. Wiara we wszechmogącego Boga żydowskiego, z którym Szymszel wiązał duże nadzieje, rozbija się o brutalne realia życia i bytu prostej żydowskiej rodziny. Chrześcijańskie miłosierdzie, współczucie do prostych ludzi w pełni przejawiły się w działalności charytatywnej pisarki, którą zajmowała się ona przez całe życie.

**Słowa-klucze:** obrzęd, Biblia, wiedźma, działalność charytatywna, zabobony, kahał, światopogląd Białorusinów, Talmud, unici, magia.